ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Репозиторий БГПУ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

| | |
|---|---|
| а) паэт сялянскага паходжання, аўтар верша «Зайграй, зайграй, хлопча малы…», каваль-віртуоз, | 1) Я. Чачот; |
| б) польскі паэт, ёсць звесткі, што пісаў пабеларуску, аўтар паэмы «Пан Тадэвуш», | 2) Я. Баршчэўскі; |
| в) паэт, аўтар шасці зборнікаў «Вясковых песень», 30 беларускіх вершаў, | 3) В. Дунін-Марцінкевіч; |
| г) ураджэнец Віцебшчыны, заўзяты збіральнік народных песень, казак, легендаў. Аўтар першага зборніка беларускай фантастыкі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» і паэмы «Рабункі мужыкоў», | 4) У. Сыракомля; |
| д) першы класік новай беларускай літаратуры, аўтар п’есы «Сялянка», паэм «Вечарніцы», «Гапон» і інш., | 5) П. Багрым; |
| е) паэт-патрыёт Літвы і Беларусі, адстойваў правы беларусаў на сваю мову, аўтар слоў знакамітага ў рускім перакладзе верша «Паштальён» | 6) А. Міцкевіч |

У канцы ўрока сумесна фармулюецца выснова пра важнейшыя здабыткі ў развіцці літаратуры і мастацтва Беларусі ў першай палове XIX ст. і падводзяцца яго вынікі. У якасці хатняга задання V узроўню можна, акрамя адпаведнага параграфа, прапанаваць вучням падрыхтаваць на памяць любімы верш з творчасці паэтаў дадзенага перыяду.

## 4.6. Тэма «Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі»

Пры вывучэнні тэмы мэтазгодна арганізаваць правядзенне інтэграванага ўрока па гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры з агульнай назвай *«К. Каліноўскі – жыццё і бессмяротнасць»*. Асноўным зместам вывучэння дадзенай тэмы з’яўляюцца рэвалюцыйна-дэмакратычная і публіцыстычная дзейнасць К. Каліноўскага, характарыстыка плыняў у нацыянальна-вызваленчым



руху ў Польшчы, Беларусі і Літве, прычыны, ход і падаўленне паўстання 1863–1864 гг. Магчымасць для ажыццяўлення інтэграцыі тлумачыцца тым, што ў курсе беларускай літаратуры дзевяцікласнікамі вывучаецца літаратурна-публіцыстычная дзейнасць К. Каліноўскага [1, с. 70].

Выбар тыпу ўрока і сродкаў навучання, якія выкарыстоўваюцца на ім, абумоўлены галоўнай дыдактычнай мэтай, на рэалізацыю якой ён быў накіраваны. Урок прымянення і ўдасканалення ведаў, уменняў і навыкаў дасць настаўнікам і вучням шырокую магчымасць рэалізаваць міжпрадметныя сувязі, выкарыстаць разнастайныя мастацкія сродкі, абудзіць пазнавальную і эмацыянальную актыўнасць школьнікаў.

Пры складанні распрацоўкі інтэграванага ўрока, якая прыводзіцца ніжэй, былі выкарыстаны матэрыялы настаўніка беларускай мовы і літаратуры В.А. Курлюты.

***Мэта ўрока:*** спрыяць фарміраванню ў вучняў цэласнага ўяўлення аб жыцці, поглядах, грамадскай і літаратурнай дзейнасці выдатнага беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата і публіцыста К. Каліноўскага.

***Задачы ўрока***

**1. *Навучання*:**

а) *па гісторыі*: стварыць умовы для раскрыцця прычын, ходу і вынікаў паўстання 1863–1864 гг. праз характарыстыку палітычных поглядаў і рэвалюцыйна-дэмакратычнай дзейнасці К. Каліноўскага;

б) *па беларускай літаратуры*: дапамагчы вучням высвятліць уклад К. Каліноўскага ў станаўленне і развіццё беларускай літаратуры і рэвалюцыйнай публіцыстыкі.

**2. *Развіцця*:** стварыць умовы для развіцця навыкаў характарыстыкі паўстанняў і гістарычных дзеячаў, работы з гістарычнымі дакументамі, пабудовы храналагічных і аналітычных табліц, абмеркавання мастацка-публіцыстычных твораў і гістарычных падзей.

**3. *Выхавання*:** садзейнічаць выхаванню пачуцця нацыянальнай годнасці, пашаны да сваей Радзімы і яе незалежнасці, павагі да нацыянальных герояў Бацькаўшчыны.



Рэпазіторый БДТУ